Яшчэ маюцца тры вакансіі: швачка, інжынер-механік ды рабочы па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый (дворнік). Прычым аклад інжынера складае 2 700 000 рублёў, дворніка — 2 500 000 рублёў.

Гэта ўсе вакансіі на сённяшні дзень у Мастах. У мясцовым РАУС пастаянна ўзнікаюць вакансіі ўчастковых, усе астатнія пасады стабільна занятыя, як і ў райвыканкаме.

ЭКАНОМІКА

НАМЕРЫ НА СУПРАЦОЎНІЦТВА І РЭАЛЬНАСЦЬ

У другі раз за апошні месяц чыноўнікі розных узроўняў абнадзейваюць рабочых ААТ «Мастоўдрэў» паказкамі пра паспяховы збыт прадукцыі. Напачатку гаварылася, што вырабы ААТ будуць пастаўляцца ва ўсе рэгіёны Расіі: ад Архангельска да Прыморскага краю, а зараз ідзе размова пра супрацоўніцтва з калінінградскім бізнесам.



ААТ «Мастоўдрэў» — буйнейшае прадпрыемства на Мастоўшчыне

У Гродзенскім аблвыканкаме адбылася сустрэча з прадпрымальнікамі гэтага расійскага рэгіёна. Пасля сустрэчы намеснік старшыні аблвыканкама Юрый Шулейка выказаў меркаванне, што «Мастоўдрэў» зможа пастаўляць прадпрыемствам гэтага рэгіёна сваю прадукцыю, паколькі дасягнута дамоўленасць на падобную сустрэчу ў бліжэйшы час у Калінінградзе вытворцаў мэблі двух рэгіёнаў.

Каб даведацца пра рэальны стан спраў ААТ «Мастоўдрэў», давялося сустрэцца з адным з вядучых спецыялістаў прадпрыемства, які, па вядомых прычынах, папрасіў не называць яго прозвішча.

Аб фінансавым стане прадпрыемства

— Сказаць, што ён цяжкі, — нічога не сказаць. Аднак банкруцтва не будзе. Дзяржава выпускае дадатковыя акцыі прадпрыемства і сама іх купляе, што дазваляе нам трымацца на плыву.

Аб рэалізацыі прадукцыі

— Праблемы значныя. Напалову яны звязаны з эканамічным крызісам. Паколькі мы наўпрост завязаны на пастаўках у Расію, то ўсё тое, што абяцаюць чыноўнікі (пастаўкі прадукцыі ад Архангельска да Камчаткі), — гэта, будзем казаць проста, намеры. Адсутнічаюць дамовы на доўгатэрміновыя буйныя пастаўкі нашай прадукцыі. А як няма збыту — няма прыбытку. Няма чым плаціць за скарыстаную электрычнасць і г. д. І як следства, частыя пераходы на скарочаны рабочы тыдзень.

Аб спыненні вытворчасці

— Чуў такое ад мастаўлян. Беспадстаўныя чуткі. Бывае, на дзень-другі электрыкі адключаюць у тым ці іншым цэху электрычнасць за няплату. Гэта часовая з`ява. А што да новай вытворчасці, то тут праводзіліся планавыя прафілактычныя работы. Цяпер з трубаў новага цэха ідзе дым, што сведчыць пра яго працу.

Аб звальненні

—Звальненне не прадугледжваецца. Па той простай прычыне, што фінансавы стан не дазваляе прадпрыемству выплачваць рабочым кампенсацыю, якая ў такіх выпадках прадугледжана законам. Ідзе спантаннае скарачэнне рабочай сілы: нехта звальняецца па ўласным жаданні, хтосьці ідзе на пенсію. На іх месца мы нікога пакуль не бярэм. Быў час, калі пасля прыняцця Дэкрэта №3 да нас па пытаннях працаўладкавання штодня звярталіся дзясяткі людзей. Але ім было адмоўлена.

Адным словам, выжываем як можам.

НАВІНЫ

«СОЛАРТУР» ПАКАЗВАЕ ДЫВАНЫ Ў ГУДЗЕВІЧАХ

Гродзенская турыстычная фірма «СоларТур» арганізавала сустрэчу, на якой экскурсаводы, тураператары і выкладчыкі распавялі аб праблемах турыстычнага бізнесу, аб самых цікавых месцах Гродзеншчыны і прапанавалі новыя маршруты для адпачынку.



Ткацкія вырабы гудзевіцкіх майстроў



Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей

Адным з найбольш удалых маршрутаў, на думку супрацоўнікаў тураператара, можа стаць вёска Гудзевічы Мастоўскага раёна, якая знакаміта не толькі дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеем, які роўна 50 гадоў таму назад заснаваў Алесь Белакоз, але і ткацтвам падвоеных дываноў. Тут могуць не толькі паказаць дываны, распавесці пра іх выраб, але і паказаць сам працэс.

Выраб падвойных дываноў на Мастоўшчыне быў адноўлены Верай Белакоз, жонкай Алеся Мікалаевіча, у 90-я гады мінулага стагоддзя. Гэтую традыцыю Вера Ігнатаўна пераняла ад Ядвігі Райскай з Адэльска, якая ўсё жыццё займалася гэтай справаю і за зіму-вясну вырабляла да 10 дываноў.

Кампазіцыі дываноў Райскай у асноўным маюць сярэдзіну і аблямоўку па краях з разетак, галінак з лісцем і кветкамі, геаметрычных элементаў і матываў, стылістыка якіх бярэ вытокі ад арнаменту мадэрну пачатку XX ст.

У 90-х гг. XX ст. Вера Белакоз заснавала гурток па ткацтве пры Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі, які паспяхова дзейнічае да сённяшняга часу. Вера Ігнатаўна мае вучаніц. Адна з іх — Кацярына Басінская, дырэктар Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музея.

На базе гудзевіцкага музея размясціўся філіял Мастоўскага раённага цэнтра рамёстваў, дзе вядзе гурток па ткацтве яшчэ адна вучаніца Белакоза, Людміла Станеўская. Яшчэ адна вучаніца — дачка Веры Ігнатаўны, Марына Камінская, узначальвае ўзорную студыю «Суквецце талентаў» пры Гродзенскім дзяржаўным абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі, дзе праводзіцца навучанне ўсім тэхнічным асаблівасцям падвойнага ткацтва.

наш край

УЛАДА Ў АСОБАХ

НА ШЛЯХУ ДА ГУБЕРНАТАРСТВА

Першы намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, 32-гадовы Дзяніс Альшэўскі ўжо каторы месяц фактычна кіруе раёнам. Ён самы малады кіраўнік такога маштабу ў рэспубліцы.

Масты — чарговая прыступка ў яго стромкай кар`ернай лесвіцы, якую яму акрэсліў былы старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра, назваўшы будучым губернатарам. Магчыма, тут Дзянісу Альшэўскаму спрыяюць яшчэ і зоркі, бо, як сцвярджаюць астролагі, сумяшчальнасць імя і прозвішча надае яго ўладальніку такія рысы: працаздольны і вязучы.

Дзяніс Аляксандравіч у 2005 годзе скончыў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт і займеў спецыяльнасць агранома. Працоўную дзейнасць распачаў з пасады памочніка загадчыка ўчастка Ваўкавыскага рэспубліканскага сельгаспрадпрыемства «Зара і К». Ужо са студзеня 2006 года выконвае абавязкі галоўнага агранома, а ў лістападзе таго ж года пераведзены стала на гэтую пасаду. Аднак тут Альшэўскі доўга не затрымліваецца. Ужо ў верасні 2007 года пераходзіць на гэткую ж пасаду ў раённае сельгаспрадпрыемства «Ваўкавыскае». Вядома, на працягу года маладому спецыялісту даскanала асвоіць працу самага важкага спецыяліста ў сельгаспрадпрыемстве даволі складана, а тым болей прадпрыемству атрымаць за такі кароткі час ад яго аддачу. На новым месцы Дзяніс Аляксандравіч працуе тры гады. У 2010 годзе ён прызначаецца дырэктарам ААТ «Хацькаўшчына».

І тут яму зорка «шанцаванне» ўсміхаецца напоўніцу.

Пасля такога, як у тым годзе Аляксандр Лукашэнка ў пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ўдзяліў вялікую ўвагу моладзі, прыцягненню яе да дзяржаўнага будаўніцтва, такія людзі былі запатрабаваныя. Сямён Шапіра падтрымаў маладога спецыяліста ды выдаў яму картбланш на будучае губернатарства. Усё гэта ўпісвалася ў абвешчаную задачу па ўкараненні ў жыццё «трох нацыянальных праектаў» абнаўлення краіны. У шэраг такіх кіраўнікоў трапляе і Дзяніс Альшэўскі. Цяпер яго асобе пільную ўвагу надае прэса. Яго імя на слыху.

Гаспадарка дасталася яму не з лепшых. Вось пра тое ён распавядае ў адным з інтэрв`ю. Найперш распачаў будаўніцтва новай канторы, бо старая знаходзілася ў прыстасаваным жылым памяшканні, якое даўно патрабавала рамонту. Слушна лічыць, што адміністрацыйны будынак — твар гаспадаркі. Прыступае да фармавання каманды спецыялістаў. Паколькі гаспадарка знаходзіцца побач з горадам, то назіраецца вялікая цякучасць кадраў. Каб спыніць яе, павышае заробкі. Паколькі загадчыкі ўчасткаў былі ў асноўным жанчыны, якія не мелі правоў кіроўцы, а даводзілася ездзіць шмат па палях, то на іх месцы прызначыў мужчын з шафёрскімі пасведчаннямі. Жанчынам была прапанавана іншая праца.

Распачалося будаўніцтва. Створана шэсць будаўнічых брыгад. Толькі распачатую справу Дзяніс Аляксандравіч не давёў да лагічнага канца. У 2013 годзе ён ужо пагадзіўся заняць пасаду дырэктара ўсё таго ж прадпрыемства «Ваўкавыскае». Але на гэтай пасадзе працуе менш за год. У верасні 2014-га Дзяніс Альшэўскі прызначаецца першым намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мастоўскага раёна. І тут надараецца збег абставін. У сувязі з хваробай старшыні райвыканкама Аляксея Шафарэвіча Дзяніс Альшэўскі фактычна становіцца кіраўніком раёна. І ўжо ён падчас вераснёўскага рэгіянальнага сходу, на якім прысутнічае дэпутат Палаты прадстаўнікоў Анатоль Коханаў, дэпутаты абласнога Савета, прадстаўнікі мясцовай улады, кіраўнікі прадпрыемстваў раёна, дакладвае пра стан спраў на Мастоўшчыне.


Дзяніс Альшэўскі

Першы намеснік старшыні — граматны спецыяліст у многіх пытаннях і не баіцца іх ставіць перад аўтарытэтамі. Калі газета «СБ» арганізавала прамую лінію з тады яшчэ кіраўніком Нацбанка Беларусі Надзеяй Ермаковай, з зададзеных ёй пытанняў найбольш слушным і прафесійным быў запыт першага намесніка старшыні Мастоўскага райвыканкама Дзяніса Альшэўскага: «Калі неільготная працэнтная стаўка знізіцца хаця б да 12% гадавых? Сёння яна ўжо каля 36%, а не 48%, як было. Але гэта ўсё роўна надта шмат, каб сельгасарганізацыі маглі дазволіць сабе інвеставаць у мадэрнізацыю і абнаўленне вытворчасці». Цытаваць адказ Ермаковай не мае сэнсу.

Сёння застаецца толькі гадаць, як доўга будзе працаваць на Мастоўшчыне Дзяніс Альшэўскі і якім будзе яго далейшы кар`ерны рост.

ПЕРСОНА

ХТО ЗАМЕНІЦЬ СЯРГЕЯ ФРАЛОВА?

Знакавая падзея, якая адбылася на мінулым тыдні ў Мастах, нікім не была агалошана. Аднак сыход з пасады дырэктара ЖКГ Сяргея Фралова ўсціш абмяркоўвае ўвесь горад.



ФОТА «ГРОДЗЕНСКАЯ ПРАЎДА»

Сяргей Фралоў каля схемы раздзельнага збору адыходаў у Мастах

Яго сыход з гэтай пасады па ўласным жаданні каментуецца мастаўлянамі пазнаму. Прычына таму — адсутнасць галоснасці.

Дзейнасць Сяргея Георгіевіча на гэтай пасадзе супярэчлівая. З аднаго боку, нядобраўпарадкаваныя двары дамоў горада і населеных пунктаў раёна, якія на ЖКГ павесілі раённыя ўлады, але не падмацавалі фінансава. З другога — паспяховае ажыццяўленне першага ў РБ праекта па паасобным зборы бытавых адходаў у межах міжнароднай праграмы ПРА ААН. Масты сталі прыкладам для Беларусі ў плане збору і перапрацоўкі бытавых адыходаў.

Сяргей Фралоў быў ініцыятарам і здзяйсняльнікам пераўтварэння былой панскай сялібы ў вёсцы Малыя Сцяпанішкі ў базу адпачынку. Праведзена рэканструкцыя будынка, збудаваны тэнісны корт. На мэце тут Фралоў меў зладзіць штучны вадаём.

З яго падачы Мастоўскае аддзяленне таварыства інвалідаў, якому ён прадставіў памяшканне, замовіла там жа яшчэ адзін праект у межах праграмы «Садзейнічанне пераходу РБ да «зялёнай» эканомікі», які быў падтрыманы. Здзяйсненне яго пачнецца праз месяц. Ім жа быў прапанаваны авантурны праект па стварэнні вытворчасці па разліве пітной вады для пастаўкі на ўнутраны рынак і ў Расію. Заставалася невялікае: напісаць бізнесплан і адшукаць інвестара.

Сыход Фралова хоць быў для многіх нечаканы, але прадказальны. Ужо паўгода таму назад ён пачаў адыходзіць ад спраў: перастаў праводзіць планёркі, выдаваць нарады ды кантраляваць ход працы.

Зараз паўстае лагічнае пытанне: хто возьме на сябе адказнасць за вядзенне той гаспадаркі, рэалізацыю праекта ААН-ЕЗ, выпраўленне фінансавага стану арганізацыі? Акрамя галоўнага інжынера і намесніка, якія непасрэдна займаюцца вытворчымі справамі прадпрыемства, як заўжды, магчымы варыянты.

Найперш не адмаўляецца заняць гэту пасаду малады ініцыятыўны кіраўнік камбіната бытавога абслугоўвання Сяргей Пяцэвіч.

Ёсць сталае меркаванне, што тую пасаду можа заняць цяперашні намеснік старшыні райвыканкама па пытаннях будаўніцтва і ЖКГ Міхаіл Жук, які працяглы час працаваў у гэтай сістэме.



Раман КАРПЕНКА
Уласны карэспандэнт
«ГС» па Зэльвенскім раёне
roma.karpenko.2014@yandex.ru
Тэл: +3751564 3-33-83

Зэльва —

КАРАТЭ

ШЕСТЬ МЕДАЛЕЙ ЗАВОЕВАЛИ КАРАТИСТЫ



Мастера WKC Владислав Гончаренко и Кирилл Малимонов

Шесть медалей завоевали два маленьких жителя Зельвы на Олимпиаде боевых искусств «Batlik Open-2015» по каратэ WKC/WKF.

Олимпиада боевых искусств, соорганизатором которой является Латвийская ассоциация каратэ, представляет собой парад самых разнообразных единоборств. Из 16 видов в этом году была ярко выражена версия каратэ WKC, чемпионат собрал 230 спортсменов в возрасте от 6 до 18 лет из Латвии, Литвы, России, Беларуси и Казахстана.

В состав сборной Белорусской федерации шотокан каратэ-до вошли спортивные клубы Минска, Волковыска, Смолевичей, Росси и Зельвы.

Зельву представлял спортивный клуб каратэ-до «Фудосин», руководителем которого является Владимир Ламеко, а сэнсэем — Сергей Снегирев. Участники турнира выступали на трех татами в течение двух дней. Программа выступлений среди женщин и мужчин включала в себя индивидуальное и командное ката, шобу-иппон кумитэ, индивидуальное и командное шобу-санбон кумитэ. Воспитанники СКК «Фудосин» Владислав Гончаренко и Кирилл Малимонов проявили как индивидуальное, так и командное мастерство, которое было вознаграждено шестью медалями (3 золотые, 2 серебряные, 1 бронзовая). Это стало в общем-то событием неудивительным, ибо зельвенский «Фудосин» всегда славился технически грамотными и волевыми бойцами.

Фото автора

ПОВОД ЗАДУМАТЬСЯ

В ПОГОНЕ

Пенсионер для афериста как гну для крокодила — самая легкая жертва. И милиция об этом хорошо осведомлена. С 1 по 4 декабря у нас на Зельвенщине органы внутренних дел проводили очередное профилактическое мероприятие «Внимание: возраст!», в рамках которого власти настоятельно рекомендовали пожилым людям избегать сомнительных сделок. Особенно с лицами, которые предлагают приобрести всевозможные порошки, корешки и бульончики омолаживающие, продлевающие жизнь и т.д. А между тем мой старик сосед накручивал диск телефона в надежде купить «панацею ото всех болезней» у «какой-то минской компании». За умопомрачительную сумму.

Лечит все!

Я у соседа спросил: «А что это… лактомарин?» Он ответил: «Не знаю. Водоросли вроде. По радио услышал, решил позвонить. Там с неким Андреем Анатольевичем разговаривал. Мне надо с холестерином проблему решить...»

Но телефонный док Андрей Анатольевич как бы между прочим обронил, что «лактомарин вообще-то лечит ВСЁ». Диабет? Безусловно. Артериальное давление? Несомненно. Простатит? Проще простого! А киста? Вы как раз по адресу!

Он был очень обходителен и предельно ясен. Док.

Важный момент: консультироваться по поводу препарата с врачами не нужно. Как только появятся деньги, старику необходимо позвонить по тому же номеру, но спросить только его, то есть Андрея Анатольевича, потому что только у него есть льготы для пенсионеров, а льготы необходимы, ибо фантастический лактомарин фантастически дорог.

Я взял у соседа номер телефона, включил диктофон, «громкую связь» и позвонил... На том конце приятный (ну а как же иначе?!) женский голос сообщил, что в течение часа со мной свяжется специалист компании по продаже препарата. Я перешел в режим ожидания. Со мной действительно связались. Но это был не «Андрей Анатольевич». И компания оказалась российской.

«Батька вас бережет»

— Алло. Здравствуйте. Мой дед требует здоровья. Мало того — он жаждет бессмертия!

— Вам помогут! — ответила трубка. — Татьяна Владимировна Пшеничных к вашим услугам. Компания «Лактомарин», Россия. По номеру вижу, вы из Гродненской области? Только что туда партию нашего продукта отправляла, коды одинаковые...

— Россия?

— Ну да. В Беларуси же нет морей и океанов. Вам известно что-нибудь о нашем продукте? Жаль. В интернете есть очень содержательные сайты. Там же вы найдете и многочисленные отзывы. Не только людей, использующих лактомарин, но и ведущих специалистов в области медицины. Почитайте... Лактомарин — это натуральный морской продукт, гель из бурых водорослей — ламинарий. Состав: альгинаты и фукоидан, 40 макро- и микроэлементов, много витаминов. Не путайте с морской капустой! Из 30 000 видов водорослей, существующих в российской акватории, наши водоросли — самые глубоководные! Их добыча невероятно трудоемка, что в итоге сказывается на цене. Цены зависят от курса лечения. Они разные: два, три и четыре месяца. Двухмесячный курс, так сказать, профилактический, включает в себя прием четырех баночек лактомарина по 500 граммов. Стоят они 3 миллиона рублей. Три месяца — 3,5 млн. рублей. Четыре месяца — 4 млн. 700 тыс. рублей. Это наши цены. Но для пенсионеров существуют льготы! Их предоставляет уже ваше государство. Сколько лет деду? 83? Отлично! Двухмесячный курс лечения будет стоить ему не 3, а 2,5 миллиона! Согласитесь, существенная скидка. Государство заботится о своих стариках.

— Вы работаете на государственном уровне?! Тогда это очень серьезно! Вы уж простите мою неуверенность, просто сейчас вокруг так много мошенников...

— Бог с вами... какое мошенничество? Мы работаем с этим продуктом уже 12 лет. Знаменитый Центр восстановительной медицины и курортологии, слышали? В России лактомарин невероятно популярен! У вас тоже, но чего нам стоило пробиться на белорусский рынок! Аж два года мы проходили клинические испытания, и в конце концов лактомарин был одобрен Минздравом Беларуси. А вы говорите — мошенничество... Батька вас очень бережет!

«Я тут главный врач»

Я принял мяч и продолжил игру:

— Мой дед жалуется на холестерин...

— Ааааа! Сердечник? Понятно. Таким я обычно рекомендую пользоваться самым длительным курсом лечения, но если люди стеснены материально, начинаем с двух месяцев. Потом продолжаем. Вы какой курс выбираете?

— Понятия не имею. Для меня вообще все это китайская грамота, я простой кузнец. Может, по поводу курса стоит проконсультироваться в поликлинике с участковым врачом?

— Не надо обращаться ни к какому врачу! Вы уже с ним консультируетесь. Я тут главный врач. Конечно... без медицинского образования очень тяжело понять, о чем я говорю. Поэтому доверьтесь мне как человеку с огромным медицинским стажем. Вижу-вижу, ваш дед давно нуждается в лактомарине!

— А вот у меня еще дочь... диабетик.



наш край

ЗА «ЧУДОМ»



— Инсулинозависимая? Превосходно! Наш гель — то, что ей надо! Для начала я приведу в порядок сахар, а потом будем отказываться от инсулина. Но как вы сами понимаете, это уже процесс не трех с половиной месяцев... Впрочем, какие могут быть деньги, когда дело касается здоровья ребенка, правда? Детям вообще принимать лактомарин сам Бог велит, он повышает иммунитет. Да вы и для себя потом закажете, я уверена! Едим гель и здоровеем, молодеем на глазах! Врачи подсадили людей на химические препараты, надо отказываться от химии и переходить на природные средства. А наш продукт — чистая органика...

— Простите, а гарантии... Гарантии какие-то будут? Деньги все-таки нешуточные...

— Стопроцентную гарантию дает только Бог. Я — 98 процентов.

—Так вот она какая... панацея.

— Больше скажу! Поскольку лекарство от рака еще не изобрели, онкологи назначают своим пациентам именно наш продукт. Он содержит онкопротектор — фукоидан, который здорово работает против раковых клеток.

— Какой бред.

— Что?

— Я говорю: отличное снадобье! Я могу его найти в аптеках Зельвы?

— В аптеках вы лактомарин не найдете. Приобрести его можно только в нашем представительстве по адресу: проспект Независимости, 30 в Минске. Дело в том, что гель — продукт натуральный, подвержен брожению и требует особых условий хранения. В холодильнике. Этого белорусские аптеки, увы, предоставить не могут, а нам очень важно поставлять людям свежий продукт. Кроме того, аптечные сети сделают на лактомарин наценку, а нам это не интересно: он и так не дешевый. Мы заботимся о клиентах. В общем, звоните в Минск, оставите для меня заявку. Только для меня, потому что только у меня есть льготы.

— Андрей Анатольевич, с которым сначала беседовал мой дед, сказал, что льготы только у него. Вы что там... за клиента рубитесь?

— Нет. У нас много потребителей. Но льготы только у меня. Причем распространяются они только на тех, кто будет работать с нами на постоянной основе. «Одноразовых» клиентов это не касается. Итак, с вами свяжется служба доставки: указываете адрес, договариваетесь на удобное вам время, и в течение трех дней курьер доставит вам продукт в сумке-холодильнике с полным пакетом документов: сертификаты качества и т.д. Оплата на месте, курьеру. Вам дадут кассовый и товарный чеки, то есть как потребитель вы защищены. После этого ваш дедушка начинает прием лактомарина. Я буду контролировать весь курс лечения отсюда, из России. По телефону.

— Я у ваших ног, доктор Пшеничных...

Многое прояснив из разговора с российским «главврачом», я набрал номер телефона **горячей линии отдела здравоохранения Гродненского облисполкома.**

— Гель «Лактомарин» российского производства действительно был одобрен Министерством здравоохранения Республики Беларусь, — подтвердил специалист отдела, *— но как биологически активная добавка (БАД), а не лекарственный препарат. «Лактомарин» не лечит, это профилактическое средство, которое, конечно же, не стоит тех денег, которые за него просят. Цены российские производители устанавливают самостоятельно. Властями они не регулируются.*

Идентификация капусты

Выслушав телефонных собеседников и изучив сайты в интернете, подвожу итог. Лохо... простите, лактомарин, безусловно, полезен. Но это самые обычные биологические добавки, которые выдают за «эликсир вечной молодости». Пшеничных утверждает, что аналогов лактомарину в мире нет. На самом деле аналог вы найдете даже в самых глухих деревнях любого государства. У нас он точно присутствует во всех магазинах и супермаркетах. Это обычная морская капуста. Сравните составы: они абсолютно идентичны. То есть если вы употребляете вместо лактомарина морскую капусту — эффект будет тот же. Между тем 2 килограмма морской капусты стоит 39 200 рублей. Тогда как 2 килограмма лактомарина — 2,5 миллиона. Чувствуете разницу?

Тут дело в подаче продукта. На простую морскую капусту надели роскошное бальное платье. Под знаменами лактомарина — армия креативных пиарщиков и трудолюбивых троллей: одни внедряют эффектную рекламу в СМИ, другие шлепают хвалебные отзывы о бурых водорослях, используя шаблонный текст и чужие фотографии.

Лактомарин — тонкий психолог. В его распоряжении — ухо старика. А старик подобен ребенку: до безобразия доверчив. Он человек советской эпохи. А для человека советской эпохи газета и радио по-прежнему рупоры Правды. То есть врать они не могут в принципе. Он, дедушка, до сих пор не может осознать: современные СМИ скажут, что Иисус был женщиной. За деньги. Лактомарин предлагает бабушке выглядеть, как Джейн Фонда в 75. Но она, бабушка, не подозревает о том, что дело не в водорослях, а в скальпеле пластического хирурга, который навязал на заднице Джейн больше узелков, чем она своими спицами в шарфе для любимого внука.

Также его втюхивают женщинам, мечтающим похудеть, детям-инвалидам, мечтающим встать на ноги.

Но дело даже не в этом. Возникает вопрос: почему цены «продавцов бессмертия» никак не контролируются государством? Почему их рекламу неустанно крутят на государственном радио? Кому на белорусском рынке выгодно держать российских шарлатанов?

Все, что приходит пока в голову: кому-то выгодно. Кто-то, видимо, недурно наживается на собственных пенсионерах.

Так что, дорогие мои старики, не верьте вы в эту «лечебно-омолаживающую» дребедень. За эти деньги лечитесь лучше в санаториях, пейте отвар из лесных да полевых трав, ешьте мед и морскую капусту из супермаркетов по цене 9 800 за банку. Благо и тем и другим наша Беларусь богата.

КО ДНЮ ИНВАЛИДА

ЗНАК ВНИМАНИЯ



От чистого детского сердца

На прошлой неделе на Зельвенщине прошла благотворительная акция, посвященная Дню инвалида.

В этот день людям с ограниченными возможностями дарила творческие зарисовки местная одаренная детвора.

Например, в Дом культуре агрогородка Деречин была организована концертная программа, которая включала в себя красочные выступления юных чтецов, танцоров и вокалистов. Побывали творческие группы в гостях у людей, которые по понятным причинам не смогли присутствовать в Доме культуры. Людей с ограничениями поддержали теплыми словами и вручили им скромные подарки.

Фото автора




В Деречине с добром и верой

Больше материалов и фото смотрите на нашем сайте WWW.GS.BY

КРЫЖАВАНКА

Беларускія прыказкі і прымаўкі



СЛОВА-ПАРОЛЬ

1 2 3 4 5 6 7

1. Чым бы … ні цешылася, абы не плакала.
2. … пятнаццаць гадоў цешчынага ката на "вы" заве.
3. Гусіны валляк не накорміш, а панскую … не напоўніш.
4. Вось вам і … , і дуга — я вам болей не слуга.
5. Як выбіўся ў паны, то … стаў адчыняць нагою…
6. Сляпому і … не паможа.
7. Лепей бедны сусед, як багаты … .
8. Меўся чорт нарадзіцца, ды … запеў.
9. Загляне … і ў наша аконца.
10. На яду … , а на работу так-сяк.
11. На тое ён і … , каб жаб глытаць.
12. Не бачыла … , што сучка сем год без хваста.
13. … і здагадка — родныя сёстры.
14. У калгасе брыгадзір — у арміі … .
15. Хоць вялікая … , ды дура.
16. Пустая … не пагаворка.
17. … — каточак, каціся ў раточак, каб не балеў жываточак.
18. Калі жана — … , то яна і чорту падноскі адарве.
19. На чужы … рота не разяўляй, а раней уставай ды свой здабывай.
20. Які поп, такі і … .
21. Галоднаму і бульбіна — … .
22. Воўча … да лесу цягне.
23. Кожныя … да сябе грабуць.
24. Дзе чарка, там і … .
25. … добрага роду: п'е гарэлку, як ваду.
26. Мужык з жонкай сварыцца — у гаршку … варыцца.
27. Ходзіць за тры вярсты … хлябаць.
28. З жыру і … шалее.
29. З міру па нітцы — голаму … .
30. Без папа вядома, што ў нядзелю … .
31. … прылятае на праталіну, шпак — на праталіну, жораў — з цяплом, а ластаўка — з лістом.
32. Для чалавека работа — найлепшы … .
33. Разумнае … прыемна і паслухаць.
34. Не гаспадар, калі … у павеці гуляе.
35. Кукушка — не … , нявестка — не дачушка.
36. Збыў тата … : жыта змалаціў, грошы прапіў.

Разгадай крыжаванку — і атрымай у падарунак піцу!

Той з нашых чытачоў, хто дашле на нумар **8 029 133-04-21** SMS-паведамленне са словам-паролем **ПЕРШЫМ** у пятніцу, **11 снежня**, пасля **16:00:00** (уключна), атрымае ў падарунак піцу! Мінулы раз пачастунак выйграў наш чытач з тэлефонным нумарам **+3754447xxx10**.

Першым нашым пераможцам і ўладальнікам піцы стаў Аляксандр Сахонь.



Аляксандр з'явіўся самым першым чытачом "ГС" — ён працуе ў абласной тыпаграфіі, дзе друкуецца наша выданне. "Заўсёды чытаю свежы нумар, які літаральна пахне друкарскай фарбай", — сказаў Аляксандр.

ВІКТАРЫНА "СЛОНІМШЧЫНА ГІСТАРЫЧНАЯ"



ад Васіля Герасімчыка

Пераможца віктарыны атрымае падпіску на паўгоддзе і Ашчадную кніжку!





Тэма 1. Найстаражытнейшы час. Слонімшчына паганская

1. Як географ Аркадзь Смоліч называў Слонімшчыну за асаблівасці яе рэльефу?

А) беларускай Германіяй;
Б) беларускай Швейцарыяй;
В) беларускай Нармандыяй;
Г) беларускай Калымой.

2. Як называліся магутныя істоты, якія, згодна з паданнямі нашых продкаў, жылі ў нашым краі да чалавека і вылучаліся вялізным ростам у 6-8 метраў? Яны вырывалі з карэннем сасновыя дрэвы і калі хадзілі, то абапіраліся на тыя, як на палкі. А калі паміралі, то над імі насыпалі вялізныя курганы.

3. Як называюцца вялізныя камяні, адарваныя ад гор на Скандынаўскім паўвостраве і прынесеныя на тэрыторыю Беларусі ледавіком? З многімі з іх звязаны шматлікія паданні і легенды. Напрыклад, каля в. Раготна пры дарозе ляжаў вялізны камень, расколаты на дзве часткі. Людзі верылі, што калісьці гэта быў суцэльны камень, пад якім пахаваны брат і сястра, забітыя жыхарамі вёскі за кровазмяшальніцтва. Грэх гэты быў настолькі жахлівы, што неба пакарала грэшнікаў нават па смерці: пасля пахавання маланка разбіла камень на дзве часткі і адсунула іх адна ад другой як доказ ненатуральнасці здзейсненага братам і сястрой граху.

4. Выберыце тры назвы населеных пунктаў, побач з якімі былі выяўлены самыя раннія стаянкі паляўнічых на паўночнага аленя ў нашым краі:

А) Чамяры *Б) Едначы*
В) Камлявічы *Г) Азярніца*
Д) Шылавічы *Е) Васілевічы*

5. Пра якія прылады працы старажытных людзей, называныя "грамавымі стрэламі", сяляне вёскі Едначы ў канцы XIX ст. расказвалі, што тыя з'яўляюцца на паверхні толькі раз у 12 гадоў пасля ўдару маланкі, а затым яны зноў хаваюцца ў зямлю? Таксама іх маглі драбніць у парашок, які ўжывалі ў якасці лекаў супраць парэзаў.

Сябры! Дасылайце адказы ў SMS-паведамленні на нумар **8 029-133-04-21** да панядзелка, **14 снежня**, ці тэлефануйце па гэтым нумары і агучвайце свае адказы. За кожны правільны адказ вам будзе налічацца бал.

У наступным нумары будуць апублікаваны яшчэ пяць пытанняў нашай віктарыны, і па суме ўсіх правільных адказаў вызначаны пераможца. (Не забудзьце ўказваць у SMS-паведамленні сваё імя і прозвішча).

Загадка нумара

Ён даўжэйшы за ўсё і — карацейшы.
Ён самы хуткі і — самы павольны.
Яго цэняць.
Калі яго многа, можна спакойна адпачыць.
Што гэта?

Сябры, дасылайце адказы ў SMS-паведамленні на нумар **8 029 133-04-21** у пятніцу, **11 снежня**, пасля **14:00:00**. Першым тром чытачам, хто прышле правільны адказ, мы вышлем магнікі (не забудзьце ўказаць сваё імя і дамашні адрас).

Пытанне: Чаму ўдар маланкі расшчапляе дрэва? **Адказ:** Вільгаць, што знаходзіцца ў клетках дрэва, пры ўдары маланкі імгненна закіпае, і пара разрывае дрэва. (Магнічак за правільны адказ на гэтае пытанне мы адправілі сланімчанцы Вераніцы.)

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

КОНКУРС

ЧЕМПИОН МИРА ПО BELLY DANCE SHOW ВРУЧАЛ СЛОНИМЧАНКАМ ДИПЛОМЫ И МЕДАЛИ

В Слониме на сцене зала кинотеатра «Мир» 32 девочки в пяти возрастных группах 3-5, 6-9, 9-10, 11-13 и 13-15 лет участвовали во втором городском фестивале по шоу-беллиданс «Аромат Востока – 2015».

Участницы представили на суд жюри танцевальные номера, которые подготовили дома. Затем в конкурсе «Импровизация» конкурсантки под музыку, которую слышали впервые, продемонстрировали импровизированный танец.

Из каждой возрастной группы члены жюри отобрали участниц, которые продолжили соревнования в финале.

Поразили своим умением самые маленькие участницы. Среди них лучшей стала Яна Малышева, второе место завоевала Вика Совенок, третье — Софья Тайкевич.

В возрастной группе 6-9 лет лучшей стала Анастасия Бортко, второе место завоевала Мая Караева, она же получила статуэтку «Ника», специальный приз от руководителя студии «Лейла» Екатерины Лопатской. Третье место поделили Маргарита Волобуева и Татьяна Сивая.

В возрастной группе 9-10 лет первое место завоевала Дарья Сыслова, второе — Анастасия Лапко, третье — Эвелина Катило.

Среди девочек 11-13 лет первое место досталось Александре Ильиной. Второе место получила Ксения Шишко, третье — Анастасия Слуцкая.

В возрастной категории 13-15 лет первое место заняла Валерия Хилько, второе — Анна Ерошенкова, третье — Екатерина Лопашова.

В ближайшее время девочки примут участие в областных и республиканских соревнованиях по беллидансу.

Дипломы и медали победительницам вручал чемпион мира-2015 по Belly dance show Дмитрий Шахриар, который возглавлял жюри. Дмитрий Шахриарх отметил, что конкурс прошёл на достойном уровне.

— Есть куда расти и есть к чему стремиться. Ваш городской конкурс — это отличный старт на республиканские и международные соревнования, — сказал чемпион мира.

Стоит отметить, что участница конкурса Александра Ильина была удостоена специального приза от чемпиона — костюма профессионального индивидуального пошива.

Дмитрий Шахриар станцевал для слонимчан и провёл для всех желающих мастер-класс.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора
Фоторепортаж и видеосюжет смотрите на сайте gs.by



Обладательница специального приза от Дмитрия Шахриара — Александра Ильина


Конкурсанты показывают импровизированный танец


На сцене Анастасия Бортко


Танцует Анна Ерошенкова


Медаль Вике Совенок вручает чемпион мира 2015 года по Belly dance show Дмитрий Шахриар

А ВЫ ЗНАЛИ, ЧТО?..

...утка может утонуть?



Утка, которая несколько дней не была на воде, при первом же погружении либо почти полностью погрузится в воду, либо вовсе утонет. Секрет того, что утка хорошо плавает, в том, что она постоянно поддерживает перышки в порядке, смазывая их жиром. Без должного ухода они пересыхают и становятся ломкими и, намокнув, больше не удерживают птицу на поверхности воды.

...некоторые птицы, чтобы добыть червяка, топают по земле лапками?

Вальдшнепы очень любят дождевых червей. А чтобы выманить их из земли, птицы иногда прибегают к хитрости. Они топчутся по земле, имитируя дождь, что и привлекает червячков к поверхности.



Страницу подготовила Татьяна ПЛАХЕТКО

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 8^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 9 декабря	0°	2°	1°
ЧЕТВЕРГ, 10 декабря	1°	4°	3°
ПЯТНИЦА, 11 декабря	-1°	3°	2°
СУББОТА, 12 декабря	0°	3°	2°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 13 декабря	1°	2°	1°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 14 декабря	1°	2°	1°
ВТОРНИК, 15 декабря	5°	7°	3°
СРЕДА, 16 декабря	4°	6°	3°

www.meteoprog.by

«Давай познакомимся»

Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Девушка-неформал, 24 года, люблю тяжёлую музыку, дождь, животных и готику, ищу парня-неформала, у которого схожие интересы. Тел. 8-029-926-85-14.

Когда-то и у тебя дом был полная чаша, когда-то и тебе времени не было нос утереть. Сейчас дети повзрослели, разъехались, свили свои гнезда, друзья полны забот. Навалилась пустота. Готовишь лишь для себя, смотришь телевизор в одиночестве. Не с кем разминуться в коридоре, некому тебя выслушать, поддержать, подать гвоздь некому.

Обязательно позвони мне. Вдруг нам повезет и наконец-то с радостью будем ждать Новогоднюю ночь, потому что в ней нас будет двое. Я заботливый, хозяйственный, ничем не злоупотребляю. Моя линейка чисел: 175; 1950. +375299521821 (Велк.), +375336524614 (МТС), 6-09-07 (дом.).

Молодой, трудолюбивый, весёлый мужчина, 34 года, желает познакомиться с молодой женщиной от 30 до 40 лет для дружбы, а в дальнейшем и серьёзных отношений. Если тебе так же одиноко, как и мне, набери мой номер. Тел. 8-033-622-72-64 (Александр).

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б,
тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!

И ДЛЯ ЭТОГО ЕСТЬ ПЯТЬ ПРИЧИН

1. «Газета Слонимская» – это газета, которая на рынке СМИ уже 18 лет. Нам можно доверять.
2. Те, кто подпишется на I полугодие 2016 года, примут участие в розыгрыше удивительных сюрпризов.
3. Подписавшись на квартал, Вы получите право на размещение в газете бесплатного частного объявления.
4. Подписная цена на «Газету Слонимскую» приемлема для всех.
5. Пенсионерам, инвалидам, участникам Великой Отечественной войны, многодетным семьям, подписавшимся на I полугодие 2016 года, 5%-я скидка

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА на 1-е полугодие 2014 года

Наименование печатного издания	на 1 месяц	на квартал	на полугодие
"Газета Слонимская" + "Отдушина"	40 000 руб.	120 000 руб.	240 000 руб.

ВЫРЕЖИ КУПОН, ЗАПОЛНИ ИЗВЕЩЕНИЕ, ПЕРЕЧИСЛИ ДЕНЬГИ НА Р/С И ОТПРАВЬ ПО АДРЕСУ: 231799, Г. СЛОНИМ, УЛ. КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 41, ИЛИ ПОЗВОНИ ПО ТЕЛ. 2-99-99, 8-029-322-06-42 — И НАШ КУРЬЕР ПОДПИШЕТ ВАС НА ДОМУ ИЛИ В ОФИСЕ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф-л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

Кассир Плательщик

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф-л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П. Плательщик

УП редакции газеты "Газета Слонимская", УНП500478342, рег. свид. №64, от 05.03.09, Мин. инф. РБ

ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА I ПОЛУГОДИЕ 2016 ГОДА

11.12.2015 ПЯТНИЦА
9.20-09.50 ОЗГИНОВИЧИ
10.10-10.40 МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.00-11.10 ОСТРОВО
11.20-11.30 МИЖЕВИЧИ
11.40-11.50 ПАСИНИЧИ
12.00-12.50 СЕЛЯВИЧИ
13.30-14.00 ОЗЕРНИЦА
14.20-14.40 ЕЛКА

18.12.2015 ПЯТНИЦА
9.20-09.30 ШИЛОВИЧИ
9.50-10.20 ЖИРОВИЧИ
10.40-11.10 ПАРТИЗАНОВКА
11.20-11.40 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
12.00-12.20 СУРИНКА
12.30-12.50 ГЛОВСЕВИЧИ
13.00-13.20 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

24.12.2015 ЧЕТВЕРГ
10.00-10.20 ЗЕЛЬВА
10.30-10.50 ДЕРЕЧИН
11.00-11.20 ГОЛЫНКА
11.40-12.10 КОСТРОВИЧИ
12.20-13.00 СЕНЬКОВЩИНА
13.10-13.30 ВАСИЛЕВИЧИ

Подписываемся под каждым словом. Подпишитесь и Вы!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 8 снежня 2015 года 16:00.
Аб'ём – шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 7315